***Таццяна Кухаронак***

## ІНФАРМАНТ І ДАСЛЕДЧЫК: СТРАТЭГІІ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ Ў ПАЛЯВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

У апошнія два дзесяцігоддзі ў сувязі з актуальнасцю і актывізацыяй рэгіянальных даследаванняў традыцыйнай культуры асноўнай крыніцай для беларускіх этнолагаў і фалькларыстаў сталі палявыя запісы, інфармацыя, атрыманая ад захавальнікаў і носьбітаў мясцовых традыцый. Даследчыкі могуць вывучаць народную культуру пры дапамозе яе непасрэдных прадстаўнікоў, творцаў. У фальклорна-этнаграфічных экспедыцыях падчас збору матэрыялаў носьбіты традыцый/інфарманты прадстаўляюць сваю культуру этнолагу (фалькларысту). Экспедыцыя з'яўляецца камунікатыўнай структурай назапашвання ведаў. Экспедыцыйная форма даследаванняў фарміруе шэраг камунікатыўных сітуацый, якія вызначаюць і формы першаснай вербалізацыі збіраемага матэрыяла. Вынікі гэтай першаснай вербалізацыі – «палявыя дадзеныя» – кладуцца ў аснову ўсіх далейшых трансфармацый, якія і складаюць фонд фальклорна-этнаграфічных ведаў [1, с. 166]. Задача даследчыка заключаецца ў тым, каб у фальклорна-этнаграфічных запісах праўдзіва гучаў «голас» носьбітаў традыцый/інфармантаў, а не дамінаваў «голас» этнолага/фалькларыста.

Аўтару дадзенага артыкула даводзіцца вывучаць традыцыйную каляндарную абраднасць. Агульны «партрэт» майго інфарманта выглядае прыкладна так: жанчына сталага веку, мясцовая ўраджэнка, якая шмат памятае і ўмее расказваць. Сваіх «бабуль» я магу знайсці як сярод удзельнікаў фальклорна-этнаграфічных гуртоў з дапамогай мясцовых культработнікаў, так і самастойна. Я бязмежна ўсім ім удзячна, кожная з маіх інфармантак заслугоўвае не толькі артыкула, а нават цэлай кнігі, але сёння я хачу сказаць добрае слова пра Казлову Надзею Данілаўну, адну з найбольш яркіх асоб сярод соцень нашых памочнікаў, захавальнікаў традыцыйнай культуры беларусаў[1].

Надзея Данілаўна нарадзілася і жыве ў в. Галавенчыцы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. Яна расказвае, што ўсяму лепшаму навучылася ад сваіх бацькоў. Маці Надзеі Данілаўны была цудоўнай спявачкай, некаторы час спявала ў царкоўным хоры, ад яе маленькая Надзя навучалася спевам. У традыцыйнай беларускай вёсцы дзяцей выхоўваў увесь лад жыцця, узаемаадносіны бацькоў і старэйшых. Бацькі былі прыкладам маральных паводзін, і дзеці непасрэдна ад іх успрымалі «кодэкс» сялянскай маралі. У першую чаргу ад бацькоў залежала, якімі выраставалі дзеці і якія тыпы ўзаемадносін пераносілі пасля ў свае сем'і. У самой Надзеі Данілаўны таксама моцная дружная сям'я. Выгадавалі з мужам чацвёра дзяцей, траіх дачок і аднаго сына, восем унукаў, тры праўнукі. На ўсе святы дарослыя дзеці разам са сваімі сем'ямі імкнуцца сабрацца ў родным доме. Надзея Данілаўна лічыць сябе шчаслівым чалавекам, бо нарадзілася на Пакровы (у беларусаў лічаць, што самыя шчаслівыя людзі нараджаюцца падчас вялікіх каляндарных святаў). Любімая яе прымаўка, якая стала дэвізам усяго жыцця: «Дабро пабяждая зло».

Казлова Н.Д. – лідэр фальклорнага калектыва «Незабудкі» Галавенчыцкага Дома народнай творчасці. Калектыў створаны ў 1957 годзе, сёння ў ім 8 удзельнікаў, жанчын 65 – 75 гадовага ўзросту. Надзея Данілаўна цудоўна спявае каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя песні, лірычныя, жартоўныя і «перажывацельныя» песні. Акрамя таго, яна цудоўная расказчыца, якая аднолькава таленавіта расказвае і пра святы, абрады, звычаі народнага календара, і пра сямейную абраднасць, а яшчэ выконвае казкі, паданні, былічкі. Вось некаторыя фрагменты з яе расказаў: «На Каляды ў гульні гулялі. У кумкі-галубкі. Дзяцей с пяць садзілі, і «маці» там стаяла. У яе спрашывалі: «Маці, маці, ці прадажна дзіцяці? – Не прадажна». Значыць, ідзе дальшы. У другой спрашывая: «Маці, маці, ці прадажна дзіцяці? – Прадажна». Адна ў адзін боку бяжыць, другая ў другі, хто пярвей к свайму дзіцяці прібяжыць».

Усе нашы інфарманты, у тым ліку і Н.Д.Казлова, ахвотна расказваюць пра традыцыйнае вяселле: «Хресная абізацельна пякла каравай. І ў маладога, і ў маладой. Мясілі, замешвалі ў дзежцы, дзялілі, цвяточкі там накладалі. Усякімі фінціфлюшачкамі, ігрушачкамі, можа, птушачкамі. Эта кажды па свойму. Маглі ўстаўляць бумажныя цвяты. Кагда даравалі, во так вызывалі: «У гэтай хаце ёсць маці-перамаці». А тады даруе, бацька, маці, усі-ўсі. Адны сідзяць і даруюць. Блюдзечка, на ім палаценца, хлеб, на ім ложуць грошы: «Дарую хлебам-соллю, шчасцем-доляй, золатам-серабром, каб жылі з дабром»; «Дарую табе анучы, каб спалі ў кучы»; «Дару табе дуб, каб быў сын Якуб». Свадзьба пааддзельна. Маладую абдаравалі, за её прііязджаець маліц і забіраець сабе. Закрываюць у камору. Назаўтра будзюць. Нада ж хату вымесьці, памыць пасуду, ложкі. Мялі хату, маладая плаця, за тоя што кружачку памылі. Назаўтра едзя с пераяпоям к маладой, с краснай гарелкай. Калі нячэсная, то не паказавалі. Такая маленькая ёлачка, вязьлі к маладому. Ад дзеўкі ехалі з ёлачкай. Маладая каждую страву далжна зьесь, як прііедзець к маладому. Для таго, як ты будзеш у палажэньні, насіць дзяцей,

[1] Падчас напісання артыкула выкарыстаны ўласныя запісы аўтара (2008 г.) і запісы М.П.Антропава, А.М.Боганевай і Т.В.Валодзінай (2006 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

будзеш усё есь, ня будзець ташніць. Каждай стравы патроху. Нявеста едзя і сваю вячэрю вязе. І мяса кусочак вязе, і аладку, і хлеб».

Звычайна былічкі расказваюць адзін аднаму ў вёсцы як незвычайную падзею, як выпадак з уласнага жыцця, перадаюць праз пакаленні як сямейнае паданне. У расказванні былічак Надзеі Данілаўне няма роўных: «Перед Купалам пашлі бабы жаць, жалі, жалі. Ай, пайдзём дамоў. Не, яшчэ толькі сем часоў, давай троху пажнём. Халадочак стаў. Ну пажнём. Аж зір – коціцца чорненькі сабачка, бяжыць чорненькі сабачка, і бяжыць, і рягоча. Яны маніць яго к сабе, а ён к рукам ня ходзя. Яны яшчэ бліжэ к яму, ён рягоча. Сабачка еты. Такі чорненькі. Можа, ваўчок ці сабачка. Што ж нам дзелаць? Ці мы яго дамоў павядзём? А ён ідзець ззаду. Яны тады: «А ідзі к чорту!». Зарягатаў і ў той мамент яго не стала».

«Сям'я малаціла, а маму зашчэпіць у хаце. Ляжыць спіць. Ноччу аднажды перяд Калядамі пастукалі ў дзверы. А мама пад дзярюгамі спала. А кросны стаялі. Заходзюць трі малайцы ў чорных касьцюмах. Адкрыла вочка і бачыла, што ў іх капыцікі. Чорныя штаны, чорныя касьцюмы, белыя рубашкі, усё. І капыты. Вісокія. Вісокія, стройныя, троя. Хадзілі, хадзілі, куруць, шчас на стале цэлы стол яств. І чайнік стаіць. Як яна ўжо там бачыла? Тряслася. Мама сама расказавала. Праўда. І чайнік стаіць. «Дунька, хадзі чай з намі піць!» Садзяцца за стол, п'юць ужо чай. А мама ні душы, ні паўдушы. Хадзілі, хадзілі так. А адзін сама большы хадзіў куріў папіросу. І іскра ўпала і перепаліла нітку. А папа мамін не куріў. Пад 12-ць часоў ідуць з малацьбы, застукалі-застукалі. І не стала нікаго. А на стале толькі асталісь корачкі калу конскага. І яны зьніклі. Мама як заплача. Папа мамін пасьвяціў назаўтра хату. Эта ўжо лічна праўда. Мама расказавала».

Гаворка Надзеі Данілаўны літаральна перасыпана прыказкамі, прымаўкамі і дасціпнымі выслоўямі, пры чым льецца ўсё гэта багацце абсалютна свабодна і нязмушана. Напрыклад, запрашаючы нас перакусіць, гаспадыня паўтарае: «Ешця, ешця – у кампаніі ж і каша саладзейшая». Выйшла праводзіць нас у дарогу і некалькі разоў паўтарыла: «Калясом дарожка». І ніколі гаспадыня не забудзе, расказваючы пра штосьці ліхое, дадаць: «Барані Бог». Яшчэ Надзея Данілаўна таленавітая майстрыха-рукадзельніца – тчэ, вышывае, вяжа карункі. Уся хата яе ўслана і ўвешана цудоўнымі ўласнымі вырабамі. Часцей за ўсё Надзея Данілаўна і яе сяброўкі з галавенчыцкіх «Незабудак» спяваюць «перажывацельныя» песні «радзі душы», якія ў навуковым ужытку называюцца «жорсткі раманс»[2]. Жорсткі раманс – гэта сентыментальная, меладраматычная песня, даволі часта літаратурнага паходжання. «Жорсткія рамансы» вызначаліся даходлівасцю і прастатой. Трапіўшы ў беларускую вёску з гарадоў, яны пацяснілі традыцыйныя песенныя жанры, трывала ўвайшлі ў рэпертуар выканаўцаў і сталі любімымі ў народзе. Дагэтуль у вясковым асяроддзі носьбіты традыцый іх так і называюць: «мілыя», «любезныя», «страдацельныя», «перажывацельныя», «сярдзечныя» песні. Гэтыя песні прываблівалі вясковых жыхароў сваёй экзотыкай, незвычайнасцю, шчырасцю і аткрытасцю пачуццяў, магчымасцю суперажываць чужому лёсу, нешчасліваму каханню, чалавечай жыццёвай трагедыі. «Жорсткі раманс» амаль заўсёды гучыць на «трасянцы». У выкананні Надзеі Данілаўны любая «перажывацельная» песня «радзі душы» напоўнена эмоцыямі і артыстызмам: «Стаканчыкі гранёныя стаялі на стале, /Дзьве парачкі влюблённыя сядзелі за сталом. /Стаканчыкі гранёныя ўпалі са стала, /Упалі ды разьбіліся, разьбіта жызь мая. /Стаканчыкі гранёныя, вас некаму сабраць, /Таску сваю і горюшка нет мамы расказаць. /Стаканчыкі гранёныя, сама вас сабяру. /Таску сваю і горюшка мілому раскажу». Нашы настаўнікі – захавальнікі, носьбіты ўсіх аспектаў традыцыі, народнай маралі, этыкі, светапогляду.

**Спіс літаратуры:**

Щепанская, Т.Б. Полевик: фигура и деятельность этнографа в экспедиционном фольклоре (опыты автоэтнографии) / Т.Б. Щепанская // Журнал социологии и социальной антропологии. – 2003. – Т.VI.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[2] У 2008 г. Н.Д.Казлова стала галоўнай гераіняй відэафільма «Жорсткі раманс», знятага РУП «Белвідэацэнтр».